слоўнікавага складу, паляпшэнню якасці маўлення. Тэкст – гэта аснова стварэння развіццёвага маўленчага асяроддзя. І пагэтаму тэкст з'яўляецца асноўным кампанентам структуры падручніка, і менавіта праз тэкст рэалізуюцца ўсе мэты навучання, адным з якіх з'яўляецца фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў. Тэкст у методыцы выкладання беларускай мовы выкарыстоўваецца як прадмет навучання, а таксама як сродак навучання іншых моўных адзінак: слоў, словазлучэння, сказа складанага сінтаксічнага цэлага, якія вывучаюцца ў структуры тэксту і засвойваюцца як важныя кампаненты маўлення. Такім чынам, тэкст 1) асноўная адзінка мовы і маўлення, 2) адзін з важных дыдактычных сродкаў на уроках беларускай мовы. Авалоданне паняццем тэкст у пачатковай школе прадугледжвае засваенне вучнямі асноўных яго прыкметаў: 1) тэкст складаецца з двух ці некалькіх сказаў; 2) тэкст мае тэму і асноўную думку, загаловак, структуру (пачатак, асноўная частка, заключэнне); 3) сказы ў тэксце звязаны паміж сабой.

Тэкст – гэта аснова стварэння на ўроках беларускай мовы развіццёвага маўленчага асяроддзя. Менавіта тэкст – асноўны кампанент структуры падручніка па беларускай мове, менавіта праз тэкст рэалізуюцца ўсе мэты навучання ў іх комплексе: камунікатыўная, адукацыйная, развіццёвая і выхаваўчая. Найбольш выніковымі з'яўляюща наступныя формы і метады арганізацыі працы з тэкстам: 1) комплексная праца з тэкстам; 2) лінгвістычны аналіз тэксту; 3) сачыненне-разважанне; 4) рэдагаванне тэксту; 5) разнастайныя віды дыктантаў; 6) праца з тэкстамі-мініяцюрамі; 7) складанне сінквейнаў; 8) камунікатыўныя і гульнявыя сітуацыі. Тэксты павінны быць цікавымі з пункту гледжання арфаграфіі, адрозніваюца стылямі, тыпамі маўлення, лексікай, утрымліваць розныя сінтаксічныя канструкцыі. Прыкладны план аналізу тэксту любога тыпу маўлення: 1.) выразнае чытанне. 2.) слоўнікавая праца. 3.) тэма тэксту. 4.) ідэя тэксту. 5.) тып тэксту. 6.) стыль тэксту. 7.) выразныя сродкі маўлення, іх роля.

Кампаненты працы з тэкстам: зразумець тэкст; тэма тэксту; асноўная думка тэксту; загаловак тэксту; пабудова (структура) тэксту; сувязь паміж часткамі тэксту; сувязь паміж сказамі ў кожнай частцы тэксту; віды тэкстаў; паняцце аб пісьмовым пераказе; паняцце аб сачыненні.

Навучальны комплексны аналіз тэксту. Выканай заданне, выкарыстоўваючы даведачны матэрыял: 1. Вызначыце, што перад вамі: слова, сказ, тэкст. 2. Дакажыце, што гэта тэкст. 3. Якім тыпам мыслення (апавяданнем, апісаннем, разважаннем) з'яўляецца дадзены тэкст? Дакажыце. 4. Вызначыце стыль тэксту. Дакажыце. 5. Вызначыце тэму і галоўную думку тэксту. 6. На што ўказвае загаловак тэксту? Уся праца з тэкстам у пачатковай школе заснавана на дыдактычных прынцыпах: а) ад простага – да складанага, ад – лёгкага да складанага; б) даступнасці; в) нагляднасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, комплексная праца з тэкстам на ўроках беларускай мовы ўключае элементы лінгвістычнага аналізу, пры гэтым настаўнік сам вызначае характар заданняў да тэкстаў і паслядоўнасць іх выканання. Аднак пры гэтым трэба ўлічваць, што тэкст – гэта складаны арганізм, у якім узаемадзейнічаюць моўныя сродкі ўсіх узроўняў моўнай сістэмы.

1. Лингводидактический словарь: более 2000 слов [Тэкст] Л.М. Щукин. – М.: Астрель, 2008. – 746 с.

## ПОСТСЕКУЛЯРНАСЦЬ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЕРШАТВОРЧАСЦІ АНДРЭЯ ХАДАНОВІЧА)

***Лонскі А.П.,***
*студэнт ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Падстаўленка В.Ф.,** канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Рэлігійная паэзія, постсекулярнасць, А. Хадановіч, ідэя, тэматыка, вобразнасць, хрысціянскія канцэпты.

Keywords. Religious poetry, post-secularity, A. Khadanovich, idea, theme, imagery, Christian concepts.

Па меркаванні многіх, збольшага заходніх, філосафаў і сацыёлагаў, зараз мы жывём у постсекулярнай эры [1], што праяўляецца ў грамадскіх стасунках, адносінах да рэлігійных інстытутаў, мастацтва, пачынаючы ад кіно і заканчваючы паэзіяй. Менавіта паэзія Андрэя Хадановіча, як нам здаецца, найбольш наглядна дэманструе, што такое ёсць постсекулярнасць, як яна рэалізуецца на беларускім "грунце". Варта таксама адзначыць, што вывучэнне ролі рэлігійных ідэй і канцэптаў у сучаснай айчыннай паэзіі дазваляе выявіць ступень значнасці пазачасавай духоўнай і маральна-этычнай сістэмы каштоўнасцей для айчыннай літаратуры.

Мэта артыкула: на прыкладзе паэзіі А. Хадановіча выявіць адметнасці постсекулярнага мастацкага мыслення творцы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання ў артыкуле паслужылі мастацкія прыклады з вершаванай спадчыны Андрэя Хадановіча. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Амерыканскі даследчык Пол Т. Корыган, які прысвяціў доктарскую дысертацыю сучаснай постсекулярнай амерыканскай паэзіі, звяртае ўвагу на гнуткасць тэрміна ў працах навукоўцаў розных галін. Ён тлумачыць *постсекулярнае* як не *антысекулярнае*, *дэсекулярнае* ці *несекулярнае*, а як *транссекулярнае*, тое, што выходзіць далёка за межы секулярнага, але не ідзе супраць, не адмаўляе яго. Такога ж тлумачэння будзем прытрымлівацца і мы.

Пол Т. Корыган выдзяляе пяць аспектаў постсекулярнага, характэрных для амерыканскай паэзіі: "1) як уласцівасць твора, напісанага ў канцы XX – пачатку XI стагоддзя; 2) выкарыстоўвае рэлігійнае ці духоўнае, але робіць гэта "з пэўным адрозненнем" – праз крытычнае прыняцце, адмаўленне, прыняцце "з разыначкай", перагляд і г.д.; 3) карыстаецца традыцыйнай рэлігійнай мовай: праз рэлігійныя вобразы, зварот да рэлігійных асоб, запазычанне літургічнай формы і г.д.; 4) ставіць на першы план традыцыйныя рэлігійныя пытанні: суперажыванне, трансцэндэнтнасць, іманентнасць, асветленасць, яднанне, цэласнасць, пакуты і г.д.; 5) выкарыстоўвае літаратурныя тропы, якія традыцыйна ўжываюцца ў рэлігійных ці духоўных мэтах: метафарызацыя невымоўнага, аповед, які выклікае суперажыванне, фрагментацыя, што стварае перажыванне бессэнсоўнасці і г. д.; 6) прымае экуменічную, нерэлігійную, міжрэлігійную альбо трансрэлігійную пазіцыю, звяртаючыся да рэлігійнай і нерэлігійнай аўдыторыі" (перакладзена мной. – А. Л.) [2, с. 30–31].

Нічога спецыфічнага, выключна амерыканскага ў гэтых крытэрыях няма, таму мы лічым цалкам лагічным іх выкарыстанне ў адносінах і да беларускай паэзіі.

У большасці вершаў Андрэя Хадановіча, у якіх ён звяртаецца да рэлігійнага, апошняе знаходзіцца ў полі зроку лірычнага героя, але заўжды недзе звонку, і дадае ў верш цікавы вобраз ці гульню слоў: "Лепш смерць ад кніжнай плесні ў галаве, чым / тэлевізійны бог, Ісус «Навін»" [3, с.29] або, напрыклад, "І вось дачакацца, калі не свабоды, / дык першых у новай эпосе каляд" [3, с.40]. Рэлігійныя вобразы тут маюць "разыначку", пра якую згадвае Корыган, але выкарыстоўваюцца мелькам, занадта хутка верш адыходзіць да свецкай вобразнасці, каб можна было б сур'ёзна разважаць пра постсекулярны дыскурс.

Зусім іншая сітуацыя ў вершах, поўнасцю пабудаваных на рэлігійнай ці духоўнай вобразнасці. Найбольш яркі прыклад, які закранае ўсе аспекты постсекулярнага па Корыгану, – верш "Хрыстос прызямліўся ў Берасці" [4, с. 75]. Амаль да самага канца ён стварае ўражанне прыкладу добрай рэлігійна-філасофскай лірыкі, дзе ўсе слупкі будуюцца па прыкладна адной схеме: "Хрыстос прызямліўся ў Берасці, / на самай мяжы эРБэ. / Расце трава – і табе расці, / і цуды рабіць – табе", пакуль у перадапошнім слупку не адкрываецца, што насамрэч апісвае аўтар: "…і ўсё, што людзі багамілі, / злятае, як дзьмухаўцы" [4, с. 75].

Такім чынам, Хадановіч з дапамогай інтэртэкстуальнай адсылкі на Караткевіча і спачатку не зусім зразумелых філасофскіх фраз ("і ўсе жывыя – з яго радні, / а мёртвы – яшчэ несмяротней") рыхтуе чытача да якога-небудзь павучальнага завяршэння, але разбівае чаканні, раскрываючы, што насамрэч верш апісвае канец свету – другое прышэсце Хрыста. Адметна, што лірычны герой тут не займае ніякай пазіцыі да рэлігій і канфесій, наадварот, у яго "і ксёнз запільвае сэлфі, / і бацюшка ў кадр лезе".

Яшчэ адзін надзвычай яркі прыклад – верш “Прадмова да кнігі Юдзіф”. У ім аўтар бярэ аднайменную прадмову аўтарства Францыска Скарыны і змешвае яе з Багушэвічавай прадмовай да зборніка “Дудка беларуская”: “Паміж пустак, балот беларускай зямлі, <…> гутарка ходзіць такая: // што анёлы бароняць крылаў сваіх, / каб не ўмёрлі; / што шатаны бароняць рылаў сваіх, / каб не ўмёрлі” [3, с.42-43] і г.д. Тут жа Хадановіч спасылаецца на класічныя творы беларускай літаратуры: “што сярпы бароняць сваіх каласоў”, “што ткачыхі бароняць сваіх паясоў”, “найлягчэйшы бароніць іншых, цяжкіх / пагарджаных век, іх, сляпых, глухіх”. Згадваецца і сам Скарына: “Беларусь бароніць сваіх Скарын”. Такім чынам, верш пазычае форму ў Скарынавай прадмовы, дадаючы самабытнае. Пры гэтым верш не дэкларуе ніякай рэлігійнай пазіцыі, а хутчэй звяртаецца да свецкіх ідэалаў нацыянальнай еднасці, рэлігійнае разам з тым ніяк не абвяргаючы, не абстрагуючыся ад яго. Разам з тым выразна адлюстроўваецца знаходжанне рэлігійнага (форма прадмовы Скарыны) над свецкім (згадкі класічных літаратурных твораў), паглынанне свецкага рэлігійным, іх сінтэз, які вядзе да яго дэсакралізацыі, характэрны постсекулярнай паэзіі.

Аналіз іншых твораў аўтара, у якіх шырока выкарыстоўваецца рэлігійная вобразнасць, сведчыць аб постсекулярнасці творчасці Андрэя Хадановіча. Гэта вершы “Азёрная школа паэзіі” [3, с.126], “Шчодры вечар” [3, с.165], “Дрыгва” [4, с.51], “Хор” [4, с.52-53], “Спачатку” [4, с.54], “Пральня” [4, с.63], асобныя раздзелы паэмы “Дзяды” [3, с.169-189] і многія іншыя творы. Важна адзначыць, што выкарыстоўваюцца там не толькі канкрэтна хрысціянскія вобразы і канцэпты. Неаднаразова, напрыклад, можна сустрэць згадкі пра карму ці ўласцівыя паганству вобразы. Прычына аўтарскай крытыкі хрысціянства ў тым, што яно гістарычна з’яўлялася і з’яўляецца важнай часткай беларускай культуры.

**Заключэнне.** Такім чынам, пры аналізе творчасці Андрэя Хадановіча мы выявілі яе постсекулярнасць. Хадановічу ўласціва дэсакралізацыя рэлігійнага і духоўнага, зніжэнне рэлігійных тэкстаў да ўзроўню літаратурных твораў. З гэтага вынікае, што і сучасныя замежныя аўтары даўно “не змагаюцца” з рэлігійнай вобразнасцю ў сваіх свецкіх творах, а актыўна апелююць да яе [1], і беларускія паэты часта выкарыстоўваюць рэлігійныя вобразы ў межах аўтарскай сістэмы постсекулярнага мастацкага мыслення.

1. Хабермас, Ю. Постсекулярное общество – что это? / Ю. Хабермас // Российская философская газета. – 2008. – № 4. – С. 1.
2. Corrigan, P. T. Wrestling with Angels: Postsecular Contemporary American Poetry. PhD dissertation. [Electronic resource] / P. T. Corrigan. – Tampa: University of South Florida, 2015. – Mode of access: https://scholarcommons.usf.edu/etd/5671. – Date of access: 09.09.2021.
3. Хадановіч, А. Дэжа вю: перавыбранае [Вершы] / А. Хадановіч. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2013. – 196 с.
4. Хадановіч, А. Школа травы: кніга вершаў / А. Хадановіч. – Мінск: Кнігазбор, 2019. – 84 с.

## АСАБЛІВАСЦІ ЎСПРЫНЯЦЦЯ І ІНТЭРПРЭТАЦЫІ РЭЦЫПІЕНТАМІ ІНФАРМАЦЫІ Ў ПУБЛІКАЦЫЯХ СМІ

***Лукашова Л.В.,***
*выпускніца ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Семянькова Г.К.,** канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Загаловак, публікацыя, сродкі масавай інфармацыі, інтэрпрэтацыя, псеўдапрэцэдэнтныя тэксты.
Key words. Title, publication, mass media, interpretation, pseudo-literary texts.

Даследчыкі аналізуюць назвы публікацый праз розныя прызмы ўспрыняцця: адны разглядаюць загалоўкі як крыніцу вывучэння асобных адзінак, другія звязваюць загалоўкі з вастрынёй і злабадзённасцю праблематыкі, трэція бачаць у радку, адведзеным пад загаловак, месца для рэкламы. Нягледзячы на разнапланавасць падыходаў, мэта вывучэння, як правіла, агульная – выяўленне спосабаў стварэння эфектыўных загалоўкаў, якія не толькі запамінаюцца і ўздзейнічаюць на чытацкую аўдыторыю, але і прыцягваюць увагу да асноўнага зместу артыкула. На жаль, аналіз беларускамоўных тэкстаў перыядычнага друку дазваляе зрабіць вывад пра тое, што часта